View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

PolotskSU



**УДК 947.6**

# РАСІЙСКІЯ ГАЗЕТЫ 1915–1917 ГАДОЎ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ВЫМУШАНАЙ МІГРАЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА З БЕЛАРУСІ

***канд. гіст. навук, дац. В. Р. КАРНЯЛЮК***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы)***

*Аналізуецца такі корпус крыніц па гісторыі вымушанай міграцыі з Беларусі, як расійскія газеты 1915–1918 гг. Выкарыстоўваюцца матэрыялы перыядычных выданняў тых рэгіёнаў Расіі, у якіх шчыльна пражывалі ў бежанстве і эвакуацыі выхадцы з беларускіх губерняў. Робіцца выснова аб выключнай значнасці гэтых крыніц для цэлага спектру праблематыкі гісторыі вымушанай міграцыі ў гады Першай сусветнай вайны.*

***Ключавыя словы****: бежанства, эвакуацыя, перыядычны друк, Беларусь, вымушаная міграцыя, Першая сусветная вайна.*

**Уводзіны**. Гісторыя вымушанай міграцыі ў гады Першай сусветнай вайны, часткамі якой былі бежанства і эвакуацыя насельніцтва з Беларусі, знайшла яскравае адлюстраванне на старонках перыядычных выданняў Расійскай імперыі. Аднак на сённяшні дзень толькі невялічкая частка гэтых крыніц уключана ў аналіз даследчыкаў. Разам з тым гэтыя перыядычныя выданні сваім зместам істотна дадаюць архіўныя крыніцы, мемуарную і эпісталярную літаратуру ў комплексным аналізе гісторыі вымушанай міграцыі насельніцтва ў гады вайны.

Вядома, што ўвесь перыядычны друк у час вайны існаваў ва ўмовах ваеннай цэнзуры. Факт цэнзурнага дазволу нават часам фіксаваўся на саміх старонках газет [1]. Але, нягледзячы на гэта, артыкулы, паведамленні, дакументы, статыстыка, зацемкі, рэпартажы, нарысы, фельетоны і іншыя газетныя матэрыялы вельмі featured рознабакова і інфарматыўна паведамлялі пра самыя розныя аспекты бежанскай з’явы. Зноў жа ва ўмовах цэнзурнага нагляду бежанская прэса была чулым барометрам жыцця, і, як ва ўсе часы, майстэрства журналіста было ў яго здольнасці данесці максімальную праўду пра актуальныя падзеі. Зыходзячы з гэтага, мэтаю нашага аналізу з’яўляецца вызначэнне спектру міграцыйнай тэматыкі расійскай прэсы 1915–1918 гг. і магчымасцяў гэтай крыніцы ў даследаванні гісторыі бежанства і эвакуацыі насельніцтва з Беларусі. Наша вывучэнне заснавана на выданнях, якія захоўваюцца ў аддзеле перыёдыкі Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў г. Хімкі.

**Асноўная частка.** Бежанцы і эвакуяваныя з польскіх, беларускіх, украінскіх, літоўскіх і латвійскіх зямель імперыі трапілі на ўсход у сотні паветаў і валасцей дзесяткаў расійскіх губерній. Гэта значыць, што газеты як агульнарасійскія, так і тыя, што выходзілі ў пэўных адміністратыўных адзінках краіны, так ці інакш мусілі закранаць і закранялі тэму вымушаных мігрантаў.

Бежанскі рух у сваім развіцці меў розныя перыяды існавання, апошнім сваім перыядам – рээвакуацыйным – сягаючы далёка за храналагічныя межы Першай сусветнай вайны. Таму яго падзеі па рознаму знайшлі адлюстраванне ў газетах таго ці іншага года Першай сусветнай вайны.

Мы выбралі выданні з тых губерняў, дзе даволі масава пражывалі беларускія бежанцы, каб даць ацэнку розным публікацыям. Безумоўна, мы не ахапілі ў сваім аналізе ўсю колькасць такіх выданняў, але выбраныя намі для аналізу газеты даюць магчымасць скласці цэласнае ўяўленне пра іх “бежанскі” змест, што дазваляе лепш арыентавацца ў іншых выданнях гэтага гістарычнага перыяду.

Варта адзначыць, што разгледжаныя выданні сталі крыніцамі для асобнага нашага даследаваня па гісторыі вымушанай міграцыі насельніцтва Беларусі ў 1914–1923 гг. Гэта маскоўская штотыднёвая газета “*Беженец*”, даведачная газета г. Масквы “*Спутник беженца, квартиронанимателя и трудящегося*”, наўгародскі штотыднёвік “*Северный беженец*”, штотыднёвік Арэнбургскага земства “*Оренбургское земское дело*”, “*Калужский курьер*”, які бачыў свет тры разы на тыдзень, штодзённая газета “*Уфимская жизнь*”, штодзённікі “*Тамбовский земский вестник*”, “*Томский вестник*”, “*Курская быль*”, штотыднёвік “*Нижегородская земская газета*”, “*Казанский телеграф*”, штодзённы “*Саратовский вестник*”, перыядычныя выданні нашых беларускіх губерняў, такія як “*Оршанский вестник*” і “*Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза*”.

Мы наўмысна ўзялі розныя – па выдаўцах, па мэтавай аўдыторыі чытачоў, па характару і зместу публікацый – выданні. Гэтыя выданні даюць магчымасць убачыць, які шырокі спектар пытанняў падымаўся ў дачыненні да падзей, звязаных з міграцыйнай палітыкай дзяржавы, у якой прымалі ўдзел як дзяржаўныя грамадзянскія і ваенныя ўстановы і арганізацыі, так і грамадскія, царкоўныя структуры самага рознага кірунку.

Выбраныя для аналізу дадзеныя чатырнадцаці газет – толькі маленькая частка ўсёй масы перыёдыкі, якая выходзіла па ўсёй імперыі. Але нам важна адзначыць характэрныя адметнасці публі-

PolotskSU



цыстычнага апавядання па нашай тэматыцы, тую танальнасць, якой прытрымліваліся аўтары публікацый ў розныя гады бежанства і увесь ваенны час, кажучы пра бежанскія праблемы. Важна было ўбачыць і тое, як сур'ёзна абмяркоўваецца гэта тэма, згадваюцца аспекты і нюансы арганізацыі дапамогі бежанцам, як апісваецца іх гаротнае жыццё, якім было стаўленне да вымушаных мігрантаў з боку розных груп людзей, розных арганізацый і як гэта стаўленне змянялася цягам трох гадоў: з 1915 па 1917 гг. Без пера-большвання бежанства стала з'яваю жыцця не толькі для саміх вымушаных мігрантаў, але і для тых, сярод каго яны жылі, хто меў непасрэднае дачыненне да іх уладкавання, да вырашэння самых розных пытанняў перамяшкання, рассялення і добраўпарадкавання бежанцаў у розных частках імперыі.

Як вядома, бежанскі рух становіцца масавым улетку 1915 г. Таму з другой паловы гэтага года і да сярэдзіны 1916 г. усе газеты напоўнены публікацыямі пра тых, хто рушыў на ўсход ва ўмовах наступлення войск Траістага Саюза на Усходнім фронце. Вымушаныя мігранты ў гэтых публікацыях – відавочныя ахвяры, вартыя жалю, дапамогі, яны нацярпеліся, пакутвалі, страцілі і сваякоў, і маёмасць. У такім выразна эмацыйным стаўленні перапляліся некалькі важных аспектаў, з якіх складаліся як афіцыйны, так і нефармальны, людскі, сапраўды народны настроі і накіраванасць на дапамогу, пад-трымку, апеку над бедакамі-мігрантамі. Мэтазгодна згадаць тыя эпітэты і параўнанні, якія супра-ваджаюць змест апавяданняў і разважанняў на бежанскую тэму і газетных тэкстах. Вось “Бежанец” публікуе інфармацыю пра тое, што нейкі купец Е. Гершуні з Варонежскай губерні на ўласныя сродкі ўладкаваў 30 сем'яў бежанцаў агульнай колькасцю 250 чалавек і прапанаваў ім і пазыку, і працу [1, с. 6]. І ў тым жа нумары ў разгорнутым паведамленні аб абмеркаванні бежанскіх праблем на Асобнай Нарадзе па ўсталяванню бежанцаў пры МУС, прыводзяцца словы аднаго з выступоўцаў, епіскапа Афанасія, пра азлабленне насельніцтва на бежанцаў, выкліканае пашкоджаннем і крадзяжом маёмасці з боку апошніх [2, с. 2]. У 1915 г. тэма бежанцаў літаральна ў кожным газетным выпуску. Нават рэкламныя абвесткі той жа наўгародскай газеты згадваюць пра зніжкі менавіта для бежанцаў: “Роберт Кенцъ. Склад Инструментов и хозяйствеенных принадлежностей. Граммофоны и пластинки. … Беженцам 10% скидка” [3, с. 4]. Такі выразна не рынкавы крок прадпрымальнікаў дадае “градусу” агульнага турбавання пра гэтых ахвяраў вайны. Важны для аналізу дадзенай перыёдыкі і фармулёўкі загалоўкаў тэкстаў, і подпісы пад імі (напрыклад, у “Калужскім кур'еры” сустракаецца чарада артыкулаў за подпісам “Беларус”).

Насычанасць эмоцый, уражанняў, разважанняў, дэталяў штодзённасці, шматгалоссе пра бежанцаў дэманструюць па-свойму ўнікальны характар гэтых гістарычных крыніц па праблеме ўзаемазносін вы-мушаных мігрантаў і мясцовага насельніцтва, па праблеме пачатку арганізацыі бежанскай дзяржаўнай палітыкі. Абедзве згаданыя праблемы важныя для вывучэння складана працэсу сацыяльнай адаптацыі бежанцаў і эвакуяваных з Беларусі ў расійскай правінцыі, разуменне якога набліжае нас да іншых ведаў – ведаў пра найскладанейшы працэс фармавання нацыянальнай самасвядомасці бежанцаў-беларусаў. А праз гэта мы набліжаемся да большага разумення працэсу нашага беларускага дзяржаўнага будаўніцтва пачатку XX ст.

Кажучы пра акалічнасці выезду бежанцаў са сваіх мясцін, аўтары паведамляюць пра патрыя-тычныя матывы, а таксама пра ваенную навалу, якая штурхала людзей да паратунку далей ад месца баявых дзеянняў [4,с. 5]. Хаця пра ўжытую тактыку “выпаленай зямлі”, пра прымусовае выгнанне сіламі вайскоўцаў, пра шматлікія рэквізіцыі, якія часта ажыццяўляліся з парушэннем усіх норм і патрабаванняў, вядома, у тэкстах гаворка не ідзе.

Самую вялікую колькасць публікацый у першы перыяд бежанскага руху складаюць тэксты, з якіх чытач даведваўся пра ўчынкі дабрачыннасці, ахвяраванняў, шчырай дапамогі тым, хто розным чынам – цягнікамі і фурманкамі – усё больш і больш прыбываў ў расійскуюю правінцыю. Асобна трэба адзна-чыць, што аўтары публікацый мэтанакіравана дэманструюць той факт, што дапамога бежанцам ідзе адусюль: прадстаўнікі ўсіх салоў'яў, усіх частак грамадства дадаюць сваю лепту [5, с. 10; 6, с. 2; 7, с. 11]. Так і павінна быць у вайне, якую афіцыйная дзяржаўная ідэалогія называла “айчыннай”. Такога кшталту публікацыі можна разглядаць, як пэўную дзяржзамову. Аднак сам змест паведамленняў пра дапамогу сведчыць пра сапраўды нефармальны яе характар. Мяркуем, што так было па прычыне сапраўднай масавай увацаркоўленасці людзей, якая натуральна ўключала ў сабе каштоўнасці дапамогі бліжняму і міласэрнасці.

Змест “бежанскіх” матэрыялаў дазваляе выкарыстоўваць іх у якасці крыніц па гісторыі царквы ў дапамозе мігрантам, аб ролі земстваў і земскіх грамадскіх арганізацый, аб арганізацыі сістэмы адукацыі і яе ролі ў забеспячэнні асветаю дзяцей бежанцаў, аб дзейнасці разнастайных бежанскіх арганізацый, аб функцыянаванні дзяржаўных цэнтральных і мясцовых бежанскіх устаноў і аб'яднанняў.

Калі ў 1915 г. у тэме бежанства ўвесь час прысутнічае элемент навіны, важны для газетнай інфармацыі, то ў 1916 г. тэма бежанства вызначаецца пэўнаю колькасцю тэкстаў, афіцыйнымі спра-ваздачамі. І гэта пры вялізарнай прысутнасці бежанцаў у паветах (напрыклад, у Тамбоўскай губерні зна-ходзілася 128 тысяч чалавек). А ў 1917 г. за перыяд з лютаўскай рэвалюцыі да чэрвеня 1917 г. у “Тамбоўскім земскім весніку” тэма бежанства ўвогуле не згадваецца [8]. Тое ж самое адбывалася на

PolotskSU



старонках “Саратаўскага весніка”, а ў Саратаўскай губерні на 1917 г. налічвалася 135 604 бежанцаў, у тым ліку, “рускіх” – 93 046, палякаў – 21 851, і габрэяў – 7 472 [9, арк. 5]. Ці ў “Аршанскім весніку”, хаця ў тым жа годзе ў Магілёскай губерні бежанскае насельніцтва складала 92 328 чалавек, сярод якіх “рускіх” 32 366, палякаў 44 357, габрэяў 12 837 [10, арк.2].

З вясны 1917 г. ідзе хваля з’ездаў – сялянскіх, земскіх, настаўніцкіх, духавенства, аднак практычна нідзе на старонках газет ніхто не ўздымаў бежанскага пытанне. Такое газетнае маўчанне выглядае кантрастам побач са шматлікасцю “бежанскіх” дакументаў адпаведных архіўных фондаў гэтага часу, напоўненых ліставаннем з бежанцамі, скаргамі і прашэннямі ад ніх, інтэнсіўным абмеркаваннем наяўных бежанскіх праблем паміж адмысловымі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі. Толькі для сродкаў масавай інфармацыі ўсе гэтыя жыццёва важныя праблемы бежанцаў не выглядаюць падзеяй. Гэта ўжо штодзённасць, да якога ўсе збольшага прыстасаваліся.

Разгледзім па парадку некаторыя асобныя газетныя матэрыялы бежанскай тэматыкі, каб адзначыць іх характэрныя і адметныя асаблівасці, значнасць для тых ці іншых аспектаў даследавання гісторыі вымушанай міграцы, выклікайнай падзеямі Першай сусветнай вайны.

Адным найбольш дыскусійным пытаннем з бежанскага жыцця было пытанне іх працаўладкавання. Яно прысутнічае ў якасці пункта абмеркавання розных губернскіх і павятовых адміністратыўных нарадаў. На іх як раз і прымаліся рашэнні, якім чынам паспрыяць мігрантам са знаходжаннем працы [11, с. 12–13]. Афіцыйная танальнасць такіх паведаменняў суседнічае з некаторымі прыкладамі выступаў мясцовых чыноўнікаў, у словах якіх можна заўважыць і эмоцыі, і нярэдка прысутасць сапраўднай разгубленасці перад складанасцю сітуацыі [12, с. 887–888]. Пра гэта сведчаць тыя прапановы, якія зыходзяць з іх вуснаў, і якія, паводле іншых звестак пра стан рэчаў у дадзеным пытанні, цяжка было рэалізаваць на практыцы. Гэта тлумачылася такімі прычынамі, як навіна праблемы, маштаб міграцыйнага руху, стан мясцовай эканомікі.

Таксама можна нярэдка сустрэць абвесткі пра прапанову рознай працы для бежанцаў і абв’явы тых бежанцаў, якія такую працу шукалі [13, с. 1; 14, с. 1; 15, с. 3]. Гэта вельмі каштоўныя крыніцы для аналізу праблемы бежанскага працаўладкавання і іх сацыялізацыі на новых, часовых месцах пражывання.

Тэма працы бежанцаў прысутнічае на старонках газет у рознай форме. Гэта і згадкі пра ўладкаванне настаўнікаў у мясцовых школах, і прыклады магчымай працы, і слушныя прапановы прафесійнага майстэрства бежанцаў, і узоры майстэрства [16, с. 14; 17, с. 9; 18, с. 15; 19, с. 4]. У рубрыцы “Адрасны стол” у гэты час можна было знайсці массу прапаноў кшталту: “Доктор С. Марголис (из Белостока)”, альбо “Д-р С.И. Пельтин (из Ломжи)” [18, с. 15]. Бежанства павярнулася да расійскага грамадства і такім нязвыклым для яго светам, і гэта было адным з істотных наступстваў гэтай гісторыкадэмаграфічнай з’явы.

Праблема працаўладкавання, так разнабакова прадстаўленая ў тагачаснай прэсе, з’яўляецца ключавой у агульным аналізе бежанскай палітыкі як царскага ўраду, так і наступных – Часовага і бальшавіцкага. І менавіта ў “спакойныя” 1915 і 1916 гг. гэтае пытанне абмяркоўваецца з шэрагам прапаноў, варыянтаў, якія адрасаваны як самім бежанцам, так і розным бежанскім арганізацыям. Газеты з’мяшчаюць матэрыялы паседжанняў губернскіх нарадаў па ўсталяванню бежанцаў, органаў земскага самакіравання. Вельмі часта ў гэтых матэрыялах згадваецца пытанне працы бежанцаў, абмяркоўваюцца спосабы яго рашэння. Такі матэрыял становіцца карысным для вывучэння намаганняў гэтых органаў мясцовай улады, аналізу іх магчымасцяў і вынікаў у вырашэні бежанскіх праблем.

Яшчэ адзін вельмі важны аспект бежанскай інфармацыі, які можна сустрэць у шэрагу перыядычных выданняў, звязаны з перманентным пошукам людзей. Характар зыходу ў бежанства абумоўлены па-сутнасці гвалтоўным выгнаннем людзей са сваіх месцаў, амаль без маёмасці, у самых экстрымальных умовах перамяшкання і далейшага рассяленяя, наступныя неаднаразовыя ўнутраныя міграцыі, выкліканыя без перабольшвання паратункам сваіх сем’яў, пошукам заробку, рэгулярныя мабілізацыі мужчын у расійскае войска – гэта і шмат іншага вялі да таго, што людзі гублялі адзін аднаго. Губляліся і дарослыя, і дзеці. Газеты ў такіх акалічнасцях станавіліся пляцоўкай камунікацыі, вельмі важным срод-кам пошуку людзей. Дарэчы, звяртае ўвагу ў такіх адвестках тое, што ў сціслай характарыстыцы тых, каго шукалі, згадвалася яго нацыянальнасць: рускі, літовец, паляк і ніколі – беларус [20, с. 8].

Газеты заўсёды выконвалі функцыю і інфарматара, і прапагандзіста. Тое ж было ў гады сусветнай вайны. У першым выпадку яны змяшчалі адпаведныя дакументы, якія дазвалялі бежанцам-чытачам лепш арыентавацца ў вельмі важных працэдурах. Возьмем да прыкладу праведзеныя рэквізіцыі маёмасці вымушаных мігрантаў [21. с. 2–3]. Іх перажылі большасць сялян-гаспадароў, і пытанне атрымання кампенсацыі за страчаную гаспадарку і знішчаную з-за ваенных (як гэта тлумачылася ўладамі) маёмасць заставалася пытаннем, да якога ўсе бежанцы вярталіся неаднаразова на працягу ўсяго свайго мігравання. Захоўваліся спісы маёмасці, і пры кожным павароце рэвалюцыйных уладавых перамен бежанцы і іх прадстаўнікі на розных сходах штораз адрасавалі пытанне былых рэквізіцый. Прапагандысцкі змест

PolotskSU



выданняў таксама мае некалькі кірункаў. Вялікі матэрыял змяшчаецца пра актыўнасць, самааданасць прадстаўнікоў розных службаў і арганізацый у справе дапамогі бежанцам. Цэлая чарада матэрыялаў пра санітарна-медыцынскую дапамогу "лятучак", змешчаных на старонках "Вестника Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза", прапануе сапраўдную карціну акалічнасцяў і выпрабаванняў, з якімі сутыкаліся ўсе, хто меў дачыненне да дапамогі бежанцам [22].

Газетныя паласы тых часоў – гэта каштоўная крыніца па праблеме міжнацыянальных зносін, па нацыянальнаму пытанню, якое ва ўмовах крызісных і ваенных абвастраецца, выходзіць у публічную плоскасць. Газеты 1915–1917 гг. сталі інфармацыйнай пляцоўкай для такога абмеркавання. Найбольш актыўна дыскутуецца "ўкраінскае и латышскае" пытанні, [23, № 2, с. 2, №5, с. 1, №6, с. 1–2]. Такі аспект, як "Расія без рускіх", які нараджаўся з'за стракатага і абсалютна пераважна не рускага нацыянальнага складу масы вымушаных мігрантаў з заходніх рэгіёнаў імперыі, – вельмі часты на старонках прэсы. Самі загалоўкі артыкулаў і зацемак кажуць пра чараду пытанняў, якія нараджала новае суседства мясцовага насельніцтва і насельніцтва бежанскага: "Мы и они", "Беженцы и общество", [24, № 119, с. 4; № 125, с. 1]. Такі змест матэрыялаў прэсы робіць іх неабходнай крыніцай па разнастайным аспектам вывучэння гісторыі нацыянльных зносін, нацыянальнага руху, у тым ліку беларускага. Таму, закранаючы нацыянальнае пытанне і бежанскі рух, нельга не засяродзіць увагу на чарадзе матэрыялаў, якія адлюстроўваюць дзейнасць нацыянальных бежанскіх структур. Газетныя звесткі з назвамі "Католическая ёлка", "Польский вечер", "В польском комитете", "Митинг беженцев-литовцев" дазваляюць, з аднаго боку, убачыць прыклады сапраўднай актыўнасці гэтых нацыянальных бежанскіх арганізацый, а з другога – зафіксаваць сам факт сведчання ў расійскай прэсе згадак пра актыўнасць прадстаўнікоў гэтых структур, што па-свойму ўжо было адметнасцю гістарычнага моманту [25, с. 3; 26, с. 2; 27, с. 2; 28, с. 3].

Гісторыя бежанства цяпер ужо незразумела без усяго комплексу гэтых перыядычных публікацый. Аднак і ў час самой вайны гэта масавае перамяшканне людзей нарадзіла вельмі шмат новых з'яў, якія літаральна прасіліся на старонкі газет, і знаходзілі там сваіх і аўтараў, і чытачоў, раскрываючы апошнім сэнс таго, што спарадзіла сусветная вайна. Напрыклад, увагу разнастайных карэспандэнтаў звярталі прыклады стасункаў бежанцаў з мясцовым насельніцтвам. Па-рознаму падавалася гэта тэма: публіцыстычным жанрам, канстатацыяй фактаў, жанрам фельетона [29; 30, с. 6; 31, с. 2; 32, с. 3]. Кожны варыянт мае сваё значэнне для аналізу гісторыі бежанскай штодзённасці, справы набліжэння да адказу на пытанне пра наступствы бежанскага руху як для саміх бежанцаў, так і для мясцовых людзей расійскай глыбінкі.

Каб растлумачыць розніцу ў характары і змесце матэрыялаў, якія бачылі свет на старонках розных выданняў, мы, вядома, найперш адказваем на пытанне пра прыналежнасць друкаванага органа. І тут на першым месцы па глыбіні і змястоўнасці матэрыялаў, на наш погляд, будуць газеты, якія адлюстроўваюць дзейнасць земстваў. Прыклад "*Вестника Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза*" – таму добрае пацвярджэнне. Непасрэдная ўключанасць у рашэнні бежанскай праблемы і арганізацыю дапамогі вымушаным мігрантам як ахвярам вайны, атрыманне і выкарыстанне дзяржаўных і прыватных сродкаў вялі да таго, што газета як орган дадзенай арганізацыі не проста згадвае пра бежанцаў і дапамогу ім, а змяшчае працяглыя, разгорнутыя дакументальныя апавяданні, справаздачы спецыялістаў, дэманстрацыю вопыту [33, № 37; 34, № 51]. Пры крытычным стаўленні да дадзенай насычанай фактамі інфармацыі, публікацыі ў земскіх выданнях – матэрыял, без якога аналіз бежанскай гісторыі не будзе поўным.

Калі падзяляць увесь аб'ём інфармацыі пра бежанства і бежанцаў, то на першае месца выходзяць матэрыялы пра падрыхтоўку, ажыццяўленне і рэалізацыю featureнабаковай дапамогі бежанцам. Тут, як мы ўжо адзначалі, прысутнічае пэўная перыядызацыя ў аб'ёме і эмацыйнай танальнасці газетных тэкстаў. Выданні 1915 г. і першай паловы 1916 г. практычна ў кожным нумары маюць згадкі пра такую дапамогу. Па-большасці – гэта інфармацыйная канстатацыя ў стужцы навінаў дня ці тыдня. Нярэдкі спецыяльныя рэпартажы, звесткі з правінцыі, якія друкавалі ўласныя карэспандэнты газет [35, с. 1; 36, с. 1]. Зразумела, што ўвесь час прысутнічае пытанне пра крытычнасць і праўдзівасць такой інфармацыі. Пры вядомых ідэалагічных устаноўках паказываць усенароднасць дапамогі, адзначым, што факт сапраўды шырокай дапамогі, якая зыходзіла ад прадстаўнікоў самых розных груп насельніцтва расійскіх гарадоў, мястэчак і вёсак, знаходзіць вельмі частае і, што важна, зафіксаванае пацвярджэнне на старонках успамінаў беластокскіх бежанцаў [37, с. 185–193].

Як вядома, формы самой дапамогі бедакам былі розныя. Механізм ажыццяўлення дапамогі, змест парадаў бежанцам, адлюстраваная ў дэталях сама атмасфера, што суправаджала сам працэс дапамогі – усё мае ўласны гістарычны інтарэс, а змест саміх публікацый – гэта корпус каштоўных крыніц, які пераkрыжоўваецца архіўнымі звесткамі, крыніцамі вуснай гісторыі і мемуарнай літаратурай. "Коўш ураджаю", кубкавы (кружачны) збор", ахвяраванні, прадастаўленне ўласнага жылля, збор харчавання, неабходных рэчаў для жыцця на новым месцы – гэта няпоўны спіс форм і відаў дабрачыннай дапамогі першага перыяду масавага бежанства [38, с. 3; 39, с. 3].

PolotskSU



Гледзячы на аб'ём і характар публікацый другой паловы 1916 г. і пачатку 1917 г. – да бежанцаў, як часткі ваеннага жыцця, у пэўнай ступені прызвычаіліся. Іх хвалі скончыліся, людзей размеркавалі па розных мясцовасцях той ці іншай губерні. Газеты, якія жывуць навіной, у бежанцах яе ўжо не мелі. Тым больш, што ўсё істотна змянілася з пачаткам рэвалюцыі. На старонках газет яшчэ можна знайсці паведамленні пра праблемы з бежанскім працаўладкаваннем, прычым прычынаю гэтых праблем бачаць саміх бежанцаў. Але пра сур'ёзны клубок, у якім знаходзілася гэта праблема, газеты не кажуць. Адначасова, пра гэта безліч прыкладаў у архіўных крыніцах. Газеты ўсё часцей, а ў хуткім часе – проста паўсюдна пачынаюць друкаваць звесткі пра суцэльнае раздзіранне грамадства, якое ўвасобілася ў пагромах, гвалце, пажарах, масавым згадваннем п'янства сярод самых розных катэгорый насельніцтва [40, с. 3]. Побач – рэгулярныя згадкі пра эканамічныя праблемы, недахоп харчавання, паўсюднае хваляванне насельніцтва. Такі інфармацыйны фон фармуе ўмовы, у якіх працягваюць жыць тыя ж тысячы бежанцаў (якія нікуды не дзеліся, нягледзячы на тое, што пра іх сталі радзей згадваць на старонках газет). І ўвесь згаданы змест перыёдыкі 1917 г. неабходна разглядаць, як плойму крыніц па гісторыі бежанства, бо менавіта ў такіх абставінах лепей аналізуюцца звароты і хадайніцтвы бежанцаў да ўсіх уладаў і іх лідараў з адным патрабаваннем і з адным заклікам: "дапамагіце вярнуцца дадому".

**Высновы**. Разгледжаныя расійскія газеты, такім чынам, пацвярджаюць ключавое значэнне перыядычных выданняў сярод крыніц гістарычнага даследавання. Тым больш такога даследавання, якое звернута на імклівы, зменлівы пад вельмі living рознымі фактарамі працэс вымушанай міграцыі, выкліканы падзеямі сусветнай вайны. Глыбокі і рознапланавы ахоп, як мага большага пераліку перыядычных выданняў, безумоўна дасць у рукі гісторыка матэрыял жывы, спрэчны, але вельмі эмацыйны і выразны. Крытычна падыходзячы да зместу паведамленняў уласных карэспандэнтаў мясцовых выданняў, рапартаў з адміністратыўных нарадаў і паседжанняў, шматлікіх інфармацыйных паведамленняў, адрасаваных да мігрантаў і тых, хто іх апякаў, і нават стракатай рэкламы, што напаўняла цэлыя паласы газет, можна атрымаць тыя падрабязнасці ці абагульненні, якія пры спалучэнні з іншымі крыніцамі дазволяць па-новаму паглядзець на такі складаны гісторыка-дэмаграфічны працэс, якім былі бежанства і эвакуацыя насельніцтва з Беларусі. Бесспрэчна, неабсяжнасцю сваёй інфармацыі расійская перыёдыка патрабуе больш дасканалага вывучэння і асэнсавання.

ЛІТАРАТУРА


1. Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза. – 1916.
2. Побольше таких // Беженец. – № 4. – 1915. – С. 6.
3. Особое совещание по устройству беженцев, 20 октября // Беженец. – № 4. – 1915. – С. 2–3.
4. Спутник беженца квартиронанимателя и трудящегося // Справочная газета. – 1915. – С. 4.
5. Особое совещание по устройству беженцев, 20 октября // Беженец. – № 1. – 1915. – С. 5.
6. Гродненский комитет по окозанию помощи беженцам // Беженец. – № 5. – 1915. – С. 10.
7. Помощь учителям-беженцам // Северный беженец. – 1916. – № 3. – 26 янв. – С. 2.
8. Приговор бурят о беженцах // Оренбургское земское дело. – 1916. – № 3. – 21 янв. – С. 11.
9. Тамбовский земский вестник. – 1916. – № 48–92.
10. Дзяржаўны Архіў Расійскай Федэрацыі (далей – ДА РФ г. Масква). – Ф. 1788. Воп. 1. Адз. зах. 85. Арк. 5.
11. ДА РФ г. Масква. – Ф. 1788. Воп. 1. Адз. зах. 85. Арк. 2.
12. Использование труда беженцев // Оренбургское земское дело. – 1916. – № 8. – 25 февр. – С. 12–13.
13. В губернской земской исполнительной комиссии по устройству беженцев // Нижегородская земская газета. – 1916. – № 22. – С. 887–888.
14. Нижегородское губернское совещание по устройству беженцев // Нижегородская земская газета. – 1916. – № 18. – С. 758–760.
15. Бюро для приискания труда беженцам // Калужский курьер. – 1915. – № 86. – 6 авг. – С. 1.
16. Беженская прислуга // Уфимская жизнь. – 1915. – № 114. – 7 окт. – С. 3.
17. Кизяки и беженцы // Оренбургское земское дело. – 1916. – № 7. – 17 февр. – С. 14.
18. Трудовая помощь евреям-беженцам в Москве // Беженец. – 1916. – № 2. – С. 9.
19. Адресный стол // Беженец. – 1916. – № 6. – С. 15.
20. Беженцы, получившие платные должности в Новгородской епархии // Северный беженец. – 1916. – № 6. – 7 февр. – С. 4.
21. Список беженцев, разыскивающих своих родных // Северный беженец. – 1916. – № 7. – 24 февр. – С. 4.
22. Деятельность врачебно-питательного пункта // Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза. – 1916. – № 47, 51, 63, 94, 180.
23. Придаточная нация // Спутник беженца квартиронанимателя и трудящегося Справочная газета. – 1915. – № 2. – С. 1; Украинцы без маски // Спутник беженца квартиронанимателя и трудящегося Справочная газета. – 1915. – № 5. – С. 1, № 6. – С. 1–2.
24. Мы и они // Калужский курьер. – 1915. – № 119. – С. 4; Беженцы и общество // Калужский курьер. – 1915. – № 125. – С. 1.
25. Католическая ёлка // Казанский телеграф. – 1916. – 8 янв. – С. 3.
26. Польский вечер // Зауральский край. – 1917. – № 5. – 6 янв. – С. 2.

PolotskSU



27. В польском комитете- выставкадетских рисунков // Зауральский край. – 1917. – № 2. – 4 янв. – С. 2.
28. Митинг беженцев-литовцев // Известия Воронежского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов. – 1918. – № 84. – 1 мая. – С. 3.
29. Особое совещание по устройству беженцев, 18 ноября // Беженец. – 1915. – № 7–8. – С. 2–3.
30. Тоска по родине // Беженец. – 1915. – № 5. – С. 6.
31. Беженцы и русская деревня // Спутник беженца квартиронанимателя и трудящегося Справочная газета. – 1915. – № 4. – 29–30 сент. – С. 2.
32. Белорус Любопытный документ // Калужский курьер. – 1915. – № 105. – 19 дек. – С. 3.
33. Врачебно-питательный пункт в Богушёвке // Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза. – 1916. – № 37. – 14 июля. – С. 2–3.
34. Деятельность врачебно-питательного пункта в М. (Из отчёта врача Р.Э. Левиной) // Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза. – 1916. – № 53. – 30 июля. – С. 2–3.
35. Великое беженство и его последствия // Листок войны. – 1915. – № 1. – 19 нояб. – С. 1.
36. Русские беженцы // Томский вестник. – 1915. – № 193. – 11 сент. – С. 1.
37. Карнялюк, В. Успаміны былых бежанцаў (1915–123) Беласточчыны як крыніца па гісторыі Беларусі п.п. XX ст. (па матэрыялах зборніка Бежанства 1915 года) / В. Карнялюк // Bialoruskie Zeszyty Historyczny. – 2002. – № 18. – S. 185–193.
38. В пользу беженцев // Томский вестник. – 1915. – № 265. – 13 дек. – С. 3.
39. Сбор в пользу беженцев // Калужский курьер. – 1915. – № 105. – 19 сент. – С. 3.
40. Разгром имений // Тамбовский земский вестник. – 1917. – № 285. – 23 дек. – С. 3.

*Пастуліў 22.09.2017*

**THE RUSSIAN NEWSPAPERS OF 1915–1918 YEARS AS SOURCES ON THE HISTORY OF FORCED MIGRATION FROM BELARUS**

***V. KARNIALIUK***

*Such body of sources on the history of forced migration from Belarus as the Russian newspapers of 1915–1918 years. Materials of periodicals in those regions of Russia, which firmly resided in the refugees and the evacuation of natives of Belarusian provinces are used. A conclusion about the exceptional importance of these sources for the whole spectrum of issues of the history of forced migration during the First world war is made.*

***Keywords**: refugees, evacuation, periodic press, Belarus, forced migration, the first world war.*